# Павел Гундзіловіч, адзін з дваццаці васьмі

## Беларускі герой-панфілавец вяртаецца з небыцця



**НЕДЗЕ ў сярэдзіне 80-х, адпраўляючы мяне ў войска, мой зямляк, ветэран вайны, поўны кавалер ордэна Славы Уладзімір Аляксандравіч Амельяновіч, выказаў такую пранізлівую і нават страшную, як мне падалося тады і падаецца сёння, праз трыццаць гадоў, думку: «У галоўным парадзе ў гонар Перамогі 24 чэрвеня 1945 года, — казаў ён, — удзельнічалі дзесяць тысяч салдат, афіцэраў, генералаў армій і франтоў. І праходзілі яны па Краснай плошчы 30 мінут. Ведаеш, пра што я падумаў? За чатыры гады вайны нашы ваенныя страты склалі амаль дзевяць мільёнаў забітых. І кожны з іх быў бы дастойны таго, каб прайсці ў тым парадным страі. Ды вось, каб усіх, хто загінуў на фронце, у партызанах, нямецкім палоне, паставіць у парадныя «каробкі», то ішлі б яны па плошчы дзевятнаццаць сутак...» Я не ведаю, як ён гэта падлічыў, бо не меў нават сярэдняй адукацыі, але...**

**Тут я, як наяве, уявіў гэты парад.**

**Парадныя «каробкі» дваццаць на дзесяць.**

**Сто дваццаць крокаў у хвіліну.**

**У абмотках і ботах, шынялях і ватоўках, у пілотках і касках, бесказырках і фуражках...**

**І дзевятнаццаць дзён і начэй праз Красную плошчу ішоў бы гэты паток паўшых батальёнаў, палкоў, дывізій. Парад пераможцаў.**

**Задумайцеся: дзевятнаццаць сутак!..**

**Крочыў бы ў гэтым страі і капітан Павел Міхайлавіч Гундзіловіч, камандзір 4-й роты 2-га батальёна 1075-га стралковага палка 316-й стралковай дывізіі. Той самай, Панфілаўскай дывізіі. Менавіта ён, капітан Гундзіловіч, кіраваў абаронай у Дубасекава (Валакаламскі раён), дзе 16 лістапада 1941 года яго рота разам з іншымі падраздзяленнямі дывізіі адбівала ўдары нямецкіх танкаў, якія рваліся да Масквы.**

**Пра подзвіг 28 герояў-панфілаўцаў сёння ведае кожны з нас. Яшчэ са школьнай праграмы вядомы імёны камандзіра 316-й стралковай дывізіі генерал-маёра Івана Васільевіча Панфілава і камісара 4-й роты 1075-га стралковага палка Васіля Клачкова. І да апошняга часу неяк вельмі сціпла, нават сарамліва, узгадвалі камандзіра той самай 4-й роты, у складзе якой змагаліся і загінулі героі, беларус Павел Міхайлавіч Гундзіловіч.**

Нарадзіўся ён у маі 1902 года ў вёсцы Літвяны Уздзенскага павета Мінскай губерні. Дарэвалюцыйнае дзяцінства нічым не адрознівалася ад лёсаў соцень і тысяч такіх жа вясковых хлапчукоў — звычайныя сялянскія турботы. У 1927 годзе закончыў Аб'яднаную беларускую ваенную школу. З гэтай навучальнай установы выйшлі многія вядомыя савецкія палкаводцы. Дастаткова толькі ўзгадаць Маршала Савецкага Саюза Івана Якубоўскага ці легендарнага дэсантніка Васіля Маргелава. Нейкі час школай камандаваў праслаўлены герой грамадзянскай вайны Ян Фабрыцыус. У музеі Вялікай Айчыннай вайны ёсць фотаздымак выпускнікоў школы. Сярод іх і Павел Гундзіловіч.

Да 1938 года Павел Міхайлавіч праходзіў службу на Далёкім Усходзе. Быў камендантам участка ў порце Находка Уладзівастоцкага пагранатрада. 29 мая 1938 года арыштаваны і ў красавіку 1940-га асуджаны па артыкулах 58-1б, 58-9 і 58-11 КК РСФСР (здрада, прычыненне шкоды сістэме транспарту, водазабеспячэння, дзяржаўнай або грамадскай маёмасці). Артыкулы гэтыя прадугледжвалі вышэйшую меру пакарання — расстрэл. Аднак нечакана крымінальная справа была спынена, і ён быў вызвалены з-пад варты. Паўла Міхайлавіча цалкам рэабілітавалі, аднавілі ў воінскім званні. Да таго часу ён перабраўся ў Казахстан, дзе ўзначаліў вінаградна-садаводчую гаспадарку.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, у жніўні 1941-га, яго накіравалі ў 316-ю стралковую дывізію, якую фарміравалі з жыхароў казахскай Алма-Аты і кіргізскага Фрунзе, а таксама станіц Надзеждзінскай і Сафійскай ваенны камісар Кіргізскай ССР Іван Панфілаў. Ён быў прызначаны камандзірам роты.

Ужо ў першых баях пад Масквой (кастрычнік 41-га) рота капітана Гундзіловіча праявіла высокую мужнасць і храбрасць, утрымліваючы рубяжы на валакаламскім напрамку.

З баявога данясення камісара палка Мухамедзьярава ў палітаддзел дывізіі:

*«4 кастрычніка 4-я рота вяла бой у раёне вёскі Русь Балотная. Камандзір роты і яе камісар паказалі сябе валявымі і адказнымі камандзірамі. Рота першай падставіла сябе смерчу куль, асколкаў і агню з боку праціўніка».*

Камандуючы 16-й арміяй тады яшчэ генерал-лейтэнант Канстанцін Ракасоўскі ў дакладзе камандуючаму Заходнім фронтам Георгію Жукаву палічыў неабходным адзначыць:

*«Рота П.М. Гундзіловіча па-ранейшаму на перадавой. Лёс палка залежыць ад таго, ці будзе ўтрымана рубеж у раёне вёскі Фядосіна. Рота таварыша Гундзіловіча першай з усіх рот вяла бой з праціўнікам. Рота страціла значную частку свайго асабовага складу, але баявыя пазіцыі ўтрымала».*

У канцы кастрычніка генерал І.В. Панфілаў таксама высока адзначыў дзеянні роты і, што называецца, «паставіў на від» камандзіру 1075-га палка І. В. Капрову: «Бярыце прыклад з 4-й роты Гундзіловіча, а яго салдат прадстаўце да ўзнагарод». Павел Міхайлавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, хоць камандаванне хадайнічала пра ордэн Чырвонага Сцяга. (Так, дарэчы, будзе і надалей: прадстаўляць Паўла Гундзіловіча да ордэна Леніна, а яму — Чырвонага Сцяга даюць, на прыступку ніжэй узнагарода. Судзімасць, хоць і цалкам знятая, сумна вядомы 58-ы артыкул так і будуць вісець над ім да апошніх дзён жыцця і нават далей.)

Наступленне на маскоўскім напрамку фашысты рыхтавалі як генеральнае, вырашальнае. Для знішчальнага ўдару па савецкіх войсках, якія стаялі на шляху да Масквы, нямецкае камандаванне засяродзіла ў трох ударных групоўках тры палявыя арміі, тры танкавыя групы і вялікую колькасць часцей узмацнення — усяго 77 дывізій (больш за 1 млн чалавек), амаль 14,5 тысячы гармат і мінамётаў і 1700 танкаў. Падтрымку сухапутных войскаў з паветра ажыццяўлялі 2-гі паветраны флот, 8-ы авіяцыйны корпус, якія мелі 950 баявых самалётаў. Войскамі камандавалі генерал-фельдмаршалы Бок і Клюге, генералы Штраус, Гудэрыян, Гот і іншыя.

Гітлер у звароце да войск 2 кастрычніка заявіў: «За тры з паловай месяцы створаны нарэшце перадумовы для таго, каб пры дапамозе магутнага ўдару сцерці сапերніка яшчэ да наступлення зімы. Уся падрыхтоўка, наколькі гэта было ў чалавечых сілах, скончана. Сёння пачынаецца апошняя вырашальная бітва гэтага года».



Камандзір 316-й стралковай дывізіі Іван ПАНФІЛАЎ.

15 лістапада гітлераўскае камандаванне павяло свае войскі ў «апошняе» наступленне на Маскву. Яно перагрупавала сілы так, каб большасць танкавых і механізаваных дывізій знаходзілася на флангах Цэнтральнага фронту і вяло наступленне на Маскву з поўначы і поўдня, спрабуючы абхапіць яе жалезнымі ацугамі. Пачалася вырашальная фаза Маскоўскай бітвы. У айчыннуй гістарыяграфіі яна ўвайшла пад назвай Клінска-Сонечнагорская абарончая аперацыя.



Пролетарии ...

КРАСНАЯ ЗВ...

ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ОРГАН НАРОДНОГО КОМИССАРИА...

№ 280 (5035) 28 ноября 1941 г., пятница

Завещание 28 павших героев

Слава герояў пачалася з нумара газеты «Красная звезда» за 28 лістапада 1941 г.

Панфілаўская дывізія заняла абарону на самым небяспечным участку. Рота капітана Гундзіловіча займала рубяжы на ўчастку каля Дубасекава. Яе асноўнай задачай было ўтрымаць тактычна важную вышыню 251 і асабліва раз'езд, дзе чыгуначны насып перасякаў шашу з Валакаламска на Маскву. На падраздзяленне, у якім налічвалася 120 салдат, прыпадала больш як кіламетр фронту ў чыстым полі. У баявым парадку палка яно было правафланговым. Далей, у лясах, абарону трымалі коннікі яшчэ аднаго беларуса — генерала Даватара.

Раніцай 15 лістапада генерал Панфілаў асабіста наведаў пазіцыі роты — прадчуваў, што тут, на флангу-стыку з суседзямі, быць першай спробе прарыву ворага. Палкавое, батальённае, ротнае начальства, а сярод іх і ён, Павел Гундзіловіч, выслухалі неабходныя парады і ўказанні.

Другая палова дня. Палкавы афіцэр Б. Джэтпысбаеў піша ва ўспамінах: «Пайшоў у 4-ю роту. Насустрач мне Гундзіловіч. Пытаюся, дзе палітрук Клачкоў. Капітан паказаў на правы фланг, у бок раз'езда Дубасекава: «Там ён, у 2-м узводзе, знаёміць людзей з бранябойкай...»

Раніца 16 лістапада. Немцы вось-вось рушаць наперад танкі. Палітрук палка Мухамедзьяраў засведчыў: «Трэба паглядзець, што і як у Гундзіловіча. Удалечыні паказаўся чалавек. Клачкоў. «Куды?» — «Ды там камандзір узвода цяжка паранены. Ну мы вырашылі з Гундзіловічам, трэба мне пайсці. Там, відаць, сёння нясоладка будзе».

Вось як яно было «нясоладка» на самай справе. (Урывак са стэнаграмы гутаркі з байцом-панфілаўцам І.Р. Васільевым, запісанай у шпіталі ў Маскве 22 снежня 1942 года):

*«16-га чысла гадзін у 6 раніцы немец стаў бамбіць наш правы і левы флангі, і нам моцна даставалася. Самалётаў з 35 нас бамбіла. Пасля паветранай бамбардзіроўкі выйшла калона аўтаматчыкаў з вёскі Красікава. Мы па аўтаматчыках адкрылі агонь. Гэта было гадзін у 7 раніцы. Аўтаматчыкаў мы адбілі.*

*Пасля гэтай атакі палітрук Клачкоў падабраўся да нашых акопаў, павітаўся з намі. — «Як вытрымалі сутычку?» — «Нічога, кажам, вытрымалі». — «Рухаюцца танкі, прыйдзецца яшчэ нам тут бой трымаць. Танкаў шмат ідзе, але нас больш. 20 танкаў, не хопіць нават на кожнага брата па танку».*

*Мы ўсе навучаліся ў знішчальным батальёне. Таму страху такога не было, каб адразу ў паніку ўдарыцца. Мы ў акопах сядзелі. «Нічога, — кажа палітрук, — сёння адбіць атаку танкаў. Адступаць няма куды».*

*Прынялі бой з гэтымі танкамі, атаку адбілі, 15 танкаў знішчылі. Танкаў 5 адступілі назад, у вёску Жданава. Палітрук Клачкоў заўважыў, што рухаецца другая партыя танкаў, і кажа: «Таварышы, напэўна, памірань нам тут прыйдзецца ў славу Радзімы. Хай Радзіма даведаецца, як мы б'ёмся, як мы абараняем Маскву. Масква — ззаду, адступаць нам няма куды»... Калі наблізілася другая партыя танкаў, Клачкоў выскачыў з акопа з гранатамі. Байцы — за ім».*

Прыкладна праз 40—50 хвілін бою абарона палка была ўсё ж пра-